10. Беларускія народныя танцы, карагоды і гульні. Энцыклапедычная бібліятэчка «Беларусь»: даведчае выданне / сост.: В.С. Семенякоў. – Мінск. : Белорусская Советская энциклопедия имени Петруся Бровки, 1989. – 138 с.

**Лапацкая А.У.,** студ. 414 гр.
Навуковы кіраўнік – Аляхновіч А.М.

# ТУРЫСТЫЧНЫ АБ’ЕКТ «ВІЛЬЯНІН ХУТАР»: ВОПЫТ ВЫКАРЫСТАННЯ

Сёння спецыялістамі ў галіне культуры прызнаецца, што патэнцыял многіх турыстычных аб’ектаў у рэгіёнах Беларусі патрабуе ўсебаковага вывучэння і паглыбленага развіцця. Прыкладам вельмі эфектыўнага выкарыстання аднаго з такіх аб’ектаў з’яўляецца функцыянаванне культурнага цэнтра «Вільянін хутар» у раённым цэнтры Вілейка Мінскай вобласці.

Сёння Вілейскі раён уваходзіць у пяцёрку найбуйнейшых раёнаў Міншчыны, але з'яўляецца самым маланаселеным у сталічнай вобласці. У Вілейцы жыве 29 тыс. чалавек. Горад месціцца на рацэ Віліі. Гэта тэрыторыя абжывалася здаўна: археалагічныя дадзеныя адносяць першыя паселішчы да культуры штрыхаванай керамікі (VII ст. да н.э. – IV ст. н.э.) [1, с. 21]. Паходжанне тапоніма «Вільянін хутар» мясцовыя жыхары тлумачаць легендай: *Жыў калісь кравец Сцяпан. Багата жыў і пашану меў у людзей, а невясёлы быў, таму што не было ў яго жонкі-красы. Падабалася Сцяпану Ульяна, якую за рост высокі і тонкі стан людзі празвалі Вельянай. Вырашыў Сцяпан прысушыць Вельяну. Раз апоўначы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*выйшаў у поле, стаў на крыжовых дарогах і прызваў да сябе цёмную сілу. Ураніцу доўга шукалі людзі Сцяпана. Здзівіліся, убачыўшы на месцы роўнага поля велізарную лагчыну, а ў ёй скамянелага Сцяпана. Як пачула Вельяна, што Сцяпан абярнуўся ў камень, пабегла непрытомная ў поле, абняла камень і залілася горкімі слязамі. Плакала яна дзень, плакала ноч, а з усходам сонейка, сканала. З яе слёз з-пад каменя прабілася крыніца і паплыла ў свет рэчка празрыстая, прыгожая, як і сама Вельяна калісь была.*

Як вядома, апошнім часам у кожным раёне імкнуцца стварыць уласны брэнд (*брэндзіраванне тэрыторый*) на аснове мясцовай гісторыі і культурных традыцый. Брэнд г. Паставы – Зюзя Паазерскі, у Бабруйску брэнд – бабёр, у Шклове – агурок, у Полацку – купец. У Вілейцы такім паэтычным сімвалам з’яўляецца дзяўчына-прыгажуня Вільяна.

Ідэя стварэння ў раёне новага культурнага і гістарычнага аб’екта, які можа стаць візітнай карткай Вілейкі, з’явілася ў 2009 г. У рамках конкурса ПРАААН перамагла стварэння аб’екта «Вільянін хутар». Ідэя галоўнага архітэктара раёна Г. Кажарновіч, якая прапанавала зрабіць хутар Вільяны на Лазневым возеры, мела, некалькі пераваг: добра ўладкаваная тэрыторыя, водная прастора, дэндрапарк, добрая бачнасць хутара з дарогі. Тут можна праводзіць святы, знаёміць падрастаючае пакаленне, дарослых і гасцей раёна з гісторыяй і традыцыямі.

Ідэю ўтварэння Вільянінага хутара падхапілі раённы Савет жанчын, раённы Савет дэпутатаў і Савет старэйшынаў. З магчымасцю з’яўлення новага аб’екта азнаёміліся краязнаўцы, гісторыкі і архітэктары. Быў распрацаваны праект аб’екта. «Вільянін хутар» лічыцца падарункам горад Вілейка на 550-годдзе. 28 жніўня 2010 г. на ім адбылося першае свята, прысвечанае адкрыццю Яно праходзіла на некалькіх пляцоўках. Ля «Брамы шчасця» гасцей свята і маладых (у гэты дзень тут справілі вяселле

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

віляйчане Яўген і Юлія Марозы) віталі Гаспадар і Гаспадыня, потым пад гукі дуды ўсе перамясціліся да «Дрэва жыцця». Супрацоўнікі мясцовага музея распавялі пра народныя вясельныя традыцыі. Ля Сцяпан-каменя выхаванцы студыі «Вілейскія забаўлянкі» Цэнтра эстэтычнага выхавання прадставілі тэатралізаваную замалёўку «Легенда пра Вілляну і Сцяпана».

У «Вільянінай хатцы» адбылося вяселле элементамі традыцыйнага абраду. Песні і танцы выконвалі гурты «Бабіна лета» (Вілейскага ПК), «Дзіва» (Куранецкага СДК), «Кола» (Язненскага СДК). На гульнёвай пляцоўцы студыя «Вілейскія забаўлянкі» прадставіла забаўляльную праграму, працаваў «Горад майстроў» – выстава вырабаў з дрэва, саломкі, лазы; гандлёвыя рады. Напрыканцы свята прайшоў дзявочы конкурс прыгажосці, таленту і ведання традыцый пад назвай «Вілляны дзівосная краса».

Такім чынам, з 2010 г. свята на гэтым культурным аб’екце стала традыцыйным. Яно ўключае конкурсныя і гульнёвыя праграмы, выставы мастацкай творчасці, плэнеры, атракцыёны. Тут ладзяцца іншыя святы і мерапрыемствы: «Рэзідэнцыя Дзеда Мароза», «Свята сярэднявечнай культуры», экалагічныя форумы, выяздныя рэгістрацыі шлюбаў, дзіцячыя дні нараджэння. Таксама культурна-турыстычны аб’ект шырока выкарыстоўваецца для пасяджэнняў клуба «Маладая сям’я», правядзення летніх моладзевых форумаў. У далейшым плануецца пашырэнне шэрагу святочных мерапрыемсіваў на аб’екце «Вільянін хутар»: ёсць наша задума правесці фальклорна-этнаграфічнае свята «Багач», Купальскую вечарыну, траецкі Русальны тыдзень. Намаганнямі супрацоўнікаў ГУ «Вілейскі краязнаўчы музей», ГУ «Вілейская цэнтралізаваная клубная сістэма», а таксама энтузіястаў з іншых устаноў культуры горада і раёна праводзіцца плённая праца па збору і захаванню мясцовых традыцый, што дазваляе выкарыстоўваць сабраны матэрыял для стварэння традыцыйных свят.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Існуюць у рабоце культурна-турыстычнага аб’екта і складанасці. Па-першае, на аб’екце не належным чынам праведзена электрычнасць, што ўскладаняе магчымасць агучвання большасці пляцовак адначасова. Па-другое, аб’ект не ахоўваецца: няма штатнага вартаўніка.

Нягледзячы на ўсе складанасці, трэба адзначыць, што турыстычны аб’ект «Вільянін хутар» карыстаецца вялікай папулярнасцю ў жыхароў раёна і займае значнае месца ў сацыяльна-культурнай прасторы горада і раёна. Рознапланавасць і рознанакіраванасць свят і мерапрыемстваў, якія праводзяцца тут, лакалізацыя, яго прыродная прыгажосць і прывабнасць – усе гэтыя аспекты вабяць жыхароў для арганізацыі свайго адпачынку ў гэтым месцы. Ёсць спадзяванні, што ў Год культуры культурна-турыстычны аб’ект «Вільянін хутар» стане візітнай карткай раёна.

---

1. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Вілейскага раёна. – Мінск : БЕЛТА 2003. – 452 с.

**Лаптенок А.А.,** студ. 101 а гр.
Научный руководитель – Филиппенко В.В.

## АНАЛИЗ ЯЗЫКОВОЙ КОНЦЕПЦИИ АНТОНЕНА АРТО В УСЛОВИЯХ ПАРАДИГМЫ ПОСТМОДЕРНИЗМА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рассматривая постмодернизм как культурологическую парадигму в первую очередь необходимо обратить внимание на особенности перехода от «культурной игры» к «игре по новым правилам», а именно: к выработке новых правил и представлений о человеке, мире, познании, культуре [6]. Радикальный разрыв с предшествующим пониманием культуры отныне